Opłate pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАШ ГОЛАС

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	**Цана абьвестак:** перад тэкстам 25 грош. сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 4 — Вільня, Субота, 5-га лютага 1927 г. — Год I

Да вызваленьня Чалавека.

У колішнім валасным судзе, які меўся выяўляць грамадзкае сумленьне гаспадара нашае зямлі—селяніна, судзілі адно толькі сялян. Гэта быў „мужыцкі суд“ — і складзены з „мужыкоў“ і празначаны, каб судзіць толькі іх.

Суд „мужыцкі“ ня меў улады над панамі. Паноў судзілі „панскія“ суды, складзеныя ўжо з прадстаўнікоў „вышэйшых станаў“. Але тыя-ж „панскія“ суды мелі ўладу ня толькі над панамі, але і—над „мужыкамі“, дый то ў найважнейшых справах, за якія прысуджалі ў катаргу на доўгія гады, а то і на ўсё жыцьцё...

Гэты падзел дзяржаўнае „юстыцыі“ (справядлівасьці“) паводле станаў быў дужа сымвалічны для тае „сацыяльнае раўнавагі“, якая захавалася і па сёньняшні дзень у буржуазных дзяржавах. Толькі-ж у „дэмакратычных“ рэспубліках пад відам „роўнасьці ўсіх станаў“ спэцыяльна „мужыцкі“ суд — для „мужыкоў—счэз: для ўсіх станаў існуе адзін... панскі“ суд!

Мы напомнілі гэтую *няроўную* „сацыяльную раўнавагу“, якая існуе ў „белых“ народаў, каб па ведамым нашаму сялянству прыкладзе лягчэй растлумачыць тое, за што на нашых вачох змагаюцца сяньня так рашуча „каляровыя“ народы, папаўшыя пад панаваньне „белых“. Найбольш яркі абраз гэтага змаганьня дае сучасны Кітай, а сымвалам тамтэйшых адносінаў між „каляровымі“ і „белымі“ людзьмі зьяўляецца, паміж іншым, і *суд*.

У Кітаі кітайскі суд можа судзіць толькі кітайцаў. Калі-ж учыніць злачынства „белы“, дык гаспадары краю ня маюць над ім ніякае ўлады, ня маюць права караць яго згодна з законамі і сумленьнем кітайскага народу. „Белага“ могуць судзіць толькі „белыя“ — тыя ягоныя таварышы, з каторымі ён супольне рабуе прыгнечаных чужынцамі кітайцаў. Як нашыя „паны“ лічылі немагчымым ды ганьбячым для сябе падчыніцца „мужыцкаму“ суду, так і белыя захватчыкі Кітаю лічаць недапусьцімым суд над сабой кітайскага народу.

Ведама, калі-б кітаец у Англіі ўчыніў які праступак і зажадаў свайго кітайскага суда,—над ім-бы толькі пасьмяяліся. Але англічанін у Кітаі і слухаць ня коча, каб яго—„белага“ — сьмеў судзіць іншы суд, апрача англійскага.

Суды — гэта толькі адзін з прыкладаў тых немагчымых адносінаў, якія „белыя культуртрэгеры“ пазаводзілі на рабаваных імі самым цынічным спосабам землях „каляровых народаў. Але прыклад гэты—найбольш характэрны. Ен найлепш паказуе, якую страшэнную няроўнасьць між людзьмі заводзяць тыя прадстаўнікі „белае“ цывілізацыі і дэмакратызму, якія і ў сябе дома для селяніна і работніка завялі „панскую“ справядлівасьць.

Дык якое дзіва, што „каляровыя“ народы адзін за адным пачынаюць скідаць ярмо белых наездчыкаў? Якое дзіва, што за апошнія гады нясупынна йдзе крывавае змаганьне прыгнечаных „белымі культуртрэгерамі“ мароканцаў, рыффэнаў, малайцаў, індусаў, кітайцаў? Барацьба за вызваленьне „каляровых“ народаў—гэта барацьба за *вызваленьне Чалавека* наагул, гэта — знак, што ня толькі сярод нашых сялян і работнікаў—белых рабоў у белых валадароў — будзіцца *пачуцьцё чалавечае годнасьці*, але і сярод народных масаў прыгнечаных рас і пляменьняў.

У агульным імкненьні працоўных усіх краёў і народаў да свайго *сацыяльнага вызваленьня* ўсё больш і больш выдатнае месца займае адначаснае імкненьне і да *вызваленьня нацыянальнага*. Гэтыя два магутныя, непераможныя, нязломныя імкненьні да *вызваленьня Чалавека* твораць разам такую вялізарную сілу, што пад ударамі яе спадуць скрышаныя путы, у якіх „белая“ буржуазія трымае ад вякоў сваіх белых і каляровых рабоў.

Падзеі ў Кітаі — найлепшы доказ гэтага.

Да нас даходзяць чысьленыя пісьмы і запытаньні з вёскі: што рабіць у гэты цяжкі для беларускіх працоўных масаў мамэнт? — Пішуць, што арышт паслоў Грамады, як натуральных абаронцаў нашых сялян і работнікаў, адбіўся ў вёсцы такім чынам, што прыпыненыя, дзякуючы заступніцтву дэпутатаў зьдзекі, узнаўляюцца, ды ізноў бываюць выпадкі біцьця і г. п.

На ўсе гэтыя пытаньні можам адказаць адно. Сілу нашым паслом давала масавая арганізацыя сялян і работнікаў, ад імя якіх выступалі дэпутаты. Але паслы нашы працавалі выключна на шляху легальнае парляманцкае барацьбы за правы і інтарэсы працоўных. Дык, каб іх праца не змарнавалася, мы і далей мусім усей грамадой, аднадушна існці тым самым легальным шляхам арганізаванае легальнае масавае самаабароны, не паддаючыся заклікам да нейкіх нелегальных выступленьняў, незалежна ад таго, ці да гэтага будуць заклікаць лішне гарачыя, але палітычна недасьпелыя ідэйныя адзінкі, ці — платныя правакатары.

Там, дзе агенты ўлады ўжываюць незаконных спосабаў змаганьня з арганізацыяй беларускіх сялян і работнікаў,—там асабліва трэба быць разважнымі і асьцярожнымі, каб не папасьці на вуду. Трэба ўсей грамадой, арганізована пратэставаць проці ўсякага беззаконьня, пасылаючы паведамленьні ды пратэсты і вышэйшым уладам, і ў Сойм, і ў сваю прэсу.

Трэба, ўрэшце, спакойна і бяз ніякага страху вясьці культурную і грамадзкую працу сваю далей, не нарушаючы існуючых законаў і правілаў, але і не даючы адбіраць ад сябе тых правоў, якія нам па закону прыналежаць.

А перадусім трэба памятаць, што „грамада — гэта вялікі чалавек“, ды што сіла працоўных — толькі ў іх арганізованасьці!

Пэпээсаускае махлярства.

Пэпээсы вядуць палітыку на два фронты: на дзеле падтрымліваюць сучасны ўрад, ды адначасна гучна выступаюць проці яго... ў прамовах і газэтных артыкулах, заяўляючы аб сваім „пераходзе ў прынцыповую, чэсную і адкрытую апазіцыю“. Ведама, першае робіцца для ўраду, а другое — для „выбаршчыкаў“ работнікаў. Ад часу гэткай „апазіцыі“ пэпээсы ўвялі вельмі спрытны спосаб публікаваньня прамоваў сваіх сяброў у Сойме.—Яны ўжо не даюць цалком гэтых прамоваў—паводле стэнаграмаў, як заўсёды рабілі раней, а даюць толькі спрытна „апрацаванае“ іх „скарочаньне“. У гэтым „скарочаньні“ ўсе выражэньні, якія маглі-б неспадабацца работніку ды адразу раскрыць яму вочы на „адкрытую апазіцыю“ пэпээсаў, старанна выкідаюцца. Наадварот, пакідаюцца больш „моцныя“ мейсцы. Напрыклад, апошняя прамова п. Недзялковскага, мастака „дэлікатнага апазіцыйнага стылю“, у абшарніцкай „Варшавянцы“ была надрукавана ў вялікім аб'ёме, як у „Работніку“. А ў гэтай прамове якраз знайшліся чысьленыя салодкія камплімэнты Марш. Пілсудскаму—побач з вострай крытыкай“ яго „оточэньня“ і ўраду.

Справа нашых паслоў у Сойме.

Ня гледзячы на заявы мін. Мэйштовіча, быццам ён „злавіў на гарачым учынку“ процідзяржаўнае дзеяльнасьці заарыштаваных паслоў-беларусаў,—справа гэта аказваецца зусім не такой простай. Соймавая камісія, якой аддадзены разгляд матэрыялаў абвінавачаньня, вось ужо другі тыдзень шукае „віны“ паслоў. Даклад яе ў пленуме Сойму адкладаецца з паседжаньня на паседжаньне. Гэтак і ў чацьвер Сойм яшчэ ня мог прыступіць да разгляду справы выдачы суду заарыштаваных паслоў-беларусаў, ды адлажыў яе на гэту пятніцу, 4 лютага.

Выступленьне проці пасла Воевудзкага.

У папярэднім нумары нашае газэты мы ўжо падалі кароценькую вестачку аб прэсавым паходзе проці пасла Воевудзкага, тварца і павадыра Незалежнае Хлопскае Партыі. Характэрна, што паход гэты пачаўся акурат пасьля таго, як польская буржуазная прэса абліла бяскарна гразёй павадыроў Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады і нашых выдатнейшых культурных дзеячоў. Ня менш характэрна, што проці пасла Воевудзкага выступіла ўрадавая прэса і прадстаўнікі ўраду, якія яго бэсьцяць за тое, што... служыў гэтаму ж самаму ўраду, супрацоўнічаючы з II аддзелам генаральнага штабу!

Што ў часе вайны служыў, як адзін з самых гарачых пілсудчыкаў, ды што і пасьля — у пачатку сваей пасольскай працы — інфармаваў II аддзел аб настроях сярод „меншасьцяў“, — ад гэтага пасол Воевудзкі не адракаецца. Але ж галоўнай віной яго у вачох улады ня можа быць тое, што ён быў ей некалі карысным, а хіба тое, што перастаў быць такім! Прынамся сама ўлада сцьвярджае, што Воевудзкі супрацоўнічаў з ёй канчаючы 1923 годам.

Аб гэтай яго працы, як высьвяняецца, ведала ўся партыя Вызваленьня, ды тады ніхто з яго партыйных калегаў-вызваленцаў, да ліку якіх належаў і цяперашні віцэ-прэм'ер Бартэль, ня бачыў у гэтым нічога ганебнага. „Дагледзілі“ гэта цяпер, калі Воевудзкі пачаў змагацца з сваімі былымі таварышамі.

Маршалак Сойму Ратай вызначыў свой „дысцыплінарны“ суд з трох паслоў — палітычных ворагаў Воевудзкага. Воевудзкі пратэставаў проці складу суда, але бяз вынікаў. Тады ён патрэбаваў, каб той суд быў прынамся адкрыты і публічны, ці каб хоць пусьцілі на яго „мужаў даверыя“ надсуднага. Але на тое суд сваей згоды ня даў.

Характэрна, што газэты, якія пачалі паход проці пасла Воевудзкага, вінавацілі яго ў тым, што ён быццам адначасна служыў і II аддзелу, і... ГПУ (раней — чрэзвычайка ў ССРР). Пасол Воевудзкі патрэбаваў, каб маршалкоўскі суд разглядзіў і гэтае пытаньне,— але і на гэта суд ня прыстаў.

Мала таго: каб разьбіць супольны сацыяльны фронт працоўных Польшчы, тыя-ж газэты падавалі весткі, быццам Воевудзкі прычыніўся да арыштаў грамадаўскіх паслоў. Проці гэтага рашуча запратэставаў апошні з астаўшыхся на волі паслоў Грамады, Сабалеўскі, які выпусьціў камунікат, дзе, паміж іншым, кажа:

„Урад, ня маючы доказаў проці арыштаваных паслоў, стараецца ўзлажыць адказнасьць за арышты беларускіх паслоў на пасла Воевудзкага. Гэта — хітры ход, разьлічаны на абаламучаньне публічнае апініі. Бо-ж кожны зразумее, што абвінавачаньне ў даносе на Грамаду — пасла Воевудзкага, сябры Незалежнае Хлопскае Партыі — гэта абсурд. Зьвяга, распачатая проці пасла Воевудзкага, зьяўляецца далейшым крокам у перасьледаваньнях, што валяцца на соймавую апазыцыю“.

Агульная дыскусія над бюджэтам у Сойме.

25 студня пачалася ў Сойме дыскусія над бюджэтам на 1927 г.

З ураду, які звычайна зьбіраецца на адчыненьне бюджэтнай дыскусіі ў поўным складзе, было ўсяго некалькі міністраў. У дадатак—ніякай праграмнай ці справаздаўчай прамовы з боку старшыні ўраду, ці міністра фінансаў, як было заўсёды навет у Польшчы. Урад маўчыць. Паслы так сама мала зацікаўлены, бо-ж ведаюць, што ані зашмат крытыкаваць ані тым больш — рабіць нейкія рэальныя вывады з сваей крытыкі ў тэй ці іншай форме—ня можна, бо—небясьпечна... Гавораць прамовы для сваіх выбаршчыкаў, але ўрад не зварачае на іх лішняе ўвагі. Сойм памірае!—гэткае ўражаньне ўва ўсіх у Краі.

Генаральны дакладчык пас. Бырка (Пяст) робіць даклад ад імя бюджэтнай камісіі. З сярдзітага бясcільля зласьлівы пястовец пускае ў бок ураду ядавітыя дасьціпы.

На 2-мільярдавы бюджэт урад вызначыў 1 мільён на будову народных школ. Гэта— ў краі, дзе 85 прац. дзяцей школьнага веку ня можа хадзіць у школы. За тое чыноўнікаў на гэты бюджэт — столькі, што тым самым апаратам можна было выканаць бюджэт—не на 2, але на 3 мільярды. На першы плян высунуты ў бюджэце выдаткі на войска—аж 30,8 працэнтаў. (Ці—каля трацiны ўсяго бюджэту). Пасьля ідуць выдаткі на асьвету (ведама-ж, польскую!)—16,4 прац., на міністэрства ўнутран. спраў (на адміністрацыю ды паліцыю) 9,4 прац. (ці — каля дзесятай часткі бюджэту), на дзяржаўныя даўгі—7,3 прац. На гаспадарчыя міністэрствы выдаткі—значна меншыя: на мін. Прамысл. і Гандлю—1,7 прац., на Публічныя Работы— 4 10 прац., на земляробства і зямельн. рэформы (чытай: асадніцтва) — па 1,8 прац., і г. д.

Вельмі асьцярожна дакладчык даў аднак-жа паняць, што забойчыя для краю выдаткі на войска зусім не гарантуюць бясьпечнасьці Польшчы звонку, бо ж—за слабыя ў параўнаньні з яе суседзямі.

Даходы Польшчы на 86.8 працэнтаў — ці амаль не на 7/8—складаюцца з падаткаў. Гэтым падаткавы вінт заціснуты над паўжывым падатнікам да канца!

Што датычыць рэальнасьці бюджэту, дык дакладчык яўна ў яе ня верыць: бюджэт на 1927 аблічаны— на падставе даходаў 1926 году, калі панавалі ў Польшчы вельмі карысныя ды шчасьлівыя гаспадарчыя варункі (англійская забастоўка, ураджай 1925 г., зьмяншэньне безрабоцьця і г. д). Цяпер усіх гэтых добрых абставінаў у Польшчы няма; безрабоцьце, напрыклад, толькі ад лістападу да студня павялічылася — з 197 да 243 тысяч. Тарговы баланс падтрымліваецца ўжо шкодна ды штучна—вывазам амаль не ўсяго збожжа з Краю. Дарагоўля расьце, прыдзецца павялічываць плату працаўнікам. Усе гэта пагражае раўнавазе бюджэту.

„Фінансавая гаспадарка,—ядавіта кажа дакладчык, — можа адзіная краіна, якая не зносіць палітычнай дыктатуры“. Трэба, каб міністар фінансаў не дазваляў выкідаць дарма грошаў. А тут раптам — створана новае міністэрства Поштаў для пасла Медзіньскага (ведамага пілсудчыка).

Першы пачаў агульную дыскусію над бюджэтам прадстаўнік эндэцкага клюбу — **Гломбіньскі**, які ў абшырнай прамове, крытыкуючы ўрад, так сама сцьвярджае вялікую няпэўнасьць бюджэтнай раўнавагі.

У канцы пасол эндэцкі заяўляе, што, хаця бюджэт зьяўляецца дзяржаўнай канешнасьцю, але яго клюб ня мае даверыя да ўраду, які трымае ўладу сілай, а ня правам. Дзеля таго эндэкі будуць галасаваць проці бюджэту.

Пэпээсавец п. **Недзялковскі** адзначае, што так званая раўнавага дзяржаўнага бюджэту Польшчы дасягнута коштам нару-

зьненьня раўнавагі сямейнага бюджэту шырокіх працоўных масаў краю.

У галіне меншасьцёвай палітыкі ўрад, ня маючы ніякай творчай моцы, падпарадкаваўся цалком нацыяналістычнай правіцы. Аб гэтым ярка сьведчаць апошнія масавыя арышты сярод беларусоў. Аднак П. П. С. будзе галасаваць за выдачу суду арыштаваных паслоў, калі будзе даведзена ў камісіі, што яны займаліся ваенным шпіёнствам на карысьць суседняй дзяржавы.

Найцікаўнейшай была заява прадстаўніка ППС, што яго клюб — „ня імкнецца да зваленьня Пілсудскага — гэтага адзінага чалавека“, як хоча эндэцыя, хаця — „ідэалам яго зьяўляецца ўрад людовы“... Вось і ўся „апазіцыя“ ППС.

Такая-ж самая „дэлікатная апазіцыя“ да ўраду, дзіўным спосабам злучаная з поўным асабістым і палітычным даверыем да яго старшыні — Пілсудскага, выяўляецца з боку „Вызваленьня“. Яго прадстаўнік п. Лыпацэвіч востра крытыкуе бюджэт, як адбіцьце агульнай палітыкі ўраду. Урад апіраецца не на „людзе“, але на спарахнелай клясе магнатаў... Аднак — „аграмадная маса нашых („Вызваленьня“, ад якога з 70 паслоў асталося ў партыі толькі 24!) выбаршчыкаў мае любоў і даверые да марш. Пілсудскага, хаця—не пераносіць гэтага даверыя на акружаючых яго асобу людзей“... І — за бюджэт вызваленцы будуць галасаваць!

Першы раз, пасьля маёвага пагрому яго ўраду, выступае п. Вітас. Ен заяўляе згары, што будзе галасаваць за бюджэт дзеля „дзяржаўнай неабходнасьці“. Але гэта не звальняе яго ад абавязку — крытыкі ўраду. Кожны ўрад мае галоўныя абавязкі: забясьпечыць граніцы вонках, забясьпечыць законнасьць ды роўнасьць грамадзян перад законам—унутры. У Польшчы ўсё гэта—наадварот. Небясьпека для граніц расьце, расьце трывога з прычыны ўнутранага парадку ў краі. Усім ясна цяпер, што ўрад маёвага пераваротy—збанкрутаваў: ня выпаўніў сваіх абяцанак, ашукаў надзеі... Навет Тугутт сьцьвярдзіў, што—„найважнейшым рэзультатам пасьля маёвай эпохі зьяўляецца... ўзрост камунізму“!

Пасол Жыдоўскага Клюбу Гартгляс кажа, што жыды, як заўсёды, судзяць урад па яго ўчынкам, ня веручы ўжо ніякім абяцанкам. „Будзэмо чакаць гэтых учынкаў, але — і наша цярплівасьць мае граніцы“...

Пасол Строньскі (хрысьціянскія дубадэкі“) ня хоча ўжо — ані хваліць ані лаяць урад: усё роўна ён ня слухае, дый наагул словы ўжо бяссільны ў Польшчы. — Усё гласьней пачынае ў Польшчы прамаўляць сама жорсткая запраўднасьць. Да яе голасу і прапануе прыслухацца аратар.

Пас. Домбскі („Сялянскі Саюз“—пілсудчыкаў) кажа, што ён павінен зьвярнуць ураду—па прыяцельску — увагу на пэўныя яго абмылкі... Якія ж гэта „абмылкі“?—Ведама-ж—драбніца: „урад ня мае праграмы—ані палітычнай, ані гаспадарчай“...

Пас. Фідэркевіч—у моцнай прамове рэзка крытыкуе ўрад, якому адмаўляе зразумела, даверыя. Трэбуе стварэньня ўраду сялян і работнікаў. Трэбуе амністыі для палітычных вязьняў. Кажучы аб зламаньні Канстытуцыі—арыштаваньнем нятыкальных паслоў, расказывае, што пас. Галавач быў арыштаваны, калі даіў карову... Гэта значыць, паводле міністра Мэйштовіча, — „злапаны на горонцым учынку збродні посполітэй“..

Пас. Пэш (немец) заяўляе, што немцы ня маюць поўнага даверыя да ўраду, — дык ня будуць галасаваць за бюджэт.

Пас. Варшаўскі (камун.) заявіў, што яго клюб адкідае без разгляду бюджэт фашыстаўскага ўраду Пілсудскага. Пасьля большую частку сваей прамовы пасол аддае разгляду справы арыштаваных паслоў, пратэстуючы проці гэтага бяспраўя.

Цікаўную і павучальную прамову сказаў прадстаўнік хадэкаў Бітнэр. Кажучы аб „ашчаднасьці“ ўраду, ён сцьвярдзіў, што ў новым бюджэце „дыспазыцыйныя фонды“ паноў міністраў узрасьлі—з 12 мільёнаў да 20. „Калі ўрад ня дасьць выясьненьня, дзеля чаго гэткая падвышка, дык мы будзем дамагацца скасаваньня гэтых фондаў зусім“. Наагул, аратар ня ведае, куды ўрад вядзе Польскую дзяржаву?

У канцы прамоўца абяцуе — з канешнасьці—галасаваць за бюджэт...

Пас. Васыньчук (Украінскі Клюб) паказывае ўсю штучнасьць ды нятрываласьць бюджэтнай раўнавагі, набудаванай на галоднай плаце работнікам, якія ня будуць мець цярплівасьці галадаць далей — з узростам дарагоўлі. Сучасны ўрад—нічым ня лепшы ў адносінах да ўкраінцаў, чым папярэднія ўрады. Урад баіцца рабіць выбары ў самаўрады ды ў Сойм, ведаючы, што з украінскіх, як і з беларускіх, абшараў польскіх мандатаў больш амаль што ня будзе... Трэба сказаць шчыра: ўрад Пілсудскага — урад фашыстаўскі... Усе — навет дробныя ўрадоўцы — па прыкладу вярхоў не прызнаюць Сойму. Украінскага Унівэрсытэту, як ня было, так і няма. Ад 90.000, кінутых урадам на так-званы „Русінскі Аддзел“, украінцы адмаўляюцца...

Клюб Каталіцка-Людовы—і той сцьвярджае, што ўрад нічога ня робіць для вясковага малазямельнага ды беззямельнага люду, аднак-жа абяцуе сваё падтрыманьне для ўраду і яго бюджэту...

Тое ж сцьвярджае адносна да работнікаў Нацыянальная Работніцкая Партыя: — урад лёгкаважыць правы і інтарэсы работнікаў, пазбавіў права на эмэрытуру больш як 20.000 чыгуншчыкаў; але партыя, навет ня маючы даверыя да гэткага ўраду, будзе галасаваць за яго бюджэт...

Ад Бел. Сял,-Раб. Грамады прамовіў пасол Сабалеўскі, крытыкуючы палітыку ўраду і востра пратэстуючы проці масавых арыштаў беларусаў, у тым ліку—паслоў.

Прамаўляў навет прадстаўнік „клюбу“ Людовых Манархістаў, які складаецца з аднаго пасла, гэты-ж пасол Цьвяковскі. Пры агульнай вясёласьці ён трэбуе, каб безадкладна ўрад прыступіў да выбару новай каралеўскай дынастыі, ды каб пэнсіі паслам былі зьменшаны на палову...

На гэтым камічным мамэньце скончылася агульная палітычная дыскусія над бюджэтам. Агульныя яе вынікі — вельмі сумныя перадусім для польскага парляментарызму.—Парлямант у Польшчы паміpае, пабіты і запужаны сьмяротна „бізуном“, ды маральна разваліваецца знутры... Ніводная партыя ня мае даверыя да ўраду, але амаль ня ўсе—будуць галасаваць за яго бюджэт...

„Наш Голас“, адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

„Зямельная рэформа“.

Урадавая прэса стараецца надаць нязвычайна вялікае значэньне выданаму толькі што „выканаўчаму распараджэньню“, ці прасьцей — інструкцыі аб правядзеньні ў жыцьцё закону аб парцэляцыі і асадніцтве з 28 сьнежня 1925 году, шумна названага ўрадам Грабскага „зямельнай рэформай“. Дык якраз на часе будзе прыпомніць, што-ж прадстаўляе гэная „зямельная рэформа“ і што яна дае—ці што магла-бы даць нашаму беларускаму гаротнаму сялянству, у вялізарбольшасьці сваей — малазямельнаму і беззямельнаму.

Як ацэнівалі яе беларусы.

Калі гэны асадніцка-парцэляцыйны закон праводзілі праз Сойм, дык на гэтым груньце нашае соймавае прадстаўніцтва адбыла цэлую баталію за зямлю для беларускага сялянства, сцьвярджаючы ў цэлым радзе пасольскіх прамоваў, што падобнага роду „зямельная рэформа“ ня толькі нічога не дае нашаму сялянству, а, наадварот, пазбаўляе яго зямлі, без якое ён сяньня мадзее. З соймавае трыбуны было ясна растлумачана, што гэны закон мае на мэце „захаваць абшарнікам крыху абрэзаныя (ад нягодных ды непатрэбных кавалкаў нявыгаднай зямлі!) іх маёнткі“, „павялічыць на вёсцы лічбу багатых сялян-кулакоў — на падмогу польскай буржуазіі, з якой абшарнікі будуць далей гаспадараваць у Краі, трымаючы большасьць яго насяленьня пад ярмом эксплёатуючай меншасьці“; што закон мае на мэце „спольшчыць — шляхам польскага асадніцтва—няпольскія Крэсы“ (прамова пасла Тарашкевіча 30 чэрвеня 1925 г.).

„Гэты Закон скіраваны сьведама на ўмацаваньне польскага валаданьня і гаспадараваньня на Усходніх Землях“;—у выніку яго „беларускі і ўкраінскі селянін—малазямельны і беззямельны—няўхільна будзе абойдзены пры набываньні зямлі, бо ня мае гатоўкі, ды гэтым засуджаны на галодную сьмерць“. „Замест-жа зьнішчанага гаспадарча і фізычна беларускага насяленьня мае павялічывацца на Крэсах польская люднасьць. Гэтага хоча польская імпэрыялістычная мысьль, каб цалком загаспадарыцца на нашых землях“ (прамова пасла Рака-Міхайлоўскага 6 ліпня 1925 г.).

„Закон аб парцэляцыі і асадніцтве, з аднаго боку, мае забясьпечыць інтарэсы абшарнікаў, а з другога—пільна глядзіць, каб не дапусьціць да зямлі элемэнты, нямілыя польскай буржуазіі“ (з прамовы пасла Валошына 6 ліпня 1925 г.)

„Закон аб асадніцтве і парцэляцыі—гэта „абвяшчэньне вайны беларускаму сялянству“.—„Пад відам „зямельнай рэформы“ ствараецца „законнае права“ адабраньня зямлі ў беларускага селяніна—дзеля эканамічнага зваяваньня сялянскіх масаў, дзеля аддачы цэлых вёсак над каманду польскіх „капралаў“—асаднікаў“. „Закон гэты прадыктаваны інстынктам самазахаваньня польскай буржуазіі, скіраваным на павялічэньне лічбы эксплёататараў на Крэсах — дзеля падтрыманьня там раўнавагі сілаў — між мільёнамі працоўнага народу і жменяй валадаючых клясаў“.—„Гэткая „зямельная рэформа“ толькі дасьць нашаму насяленьню—замест аднаго пана-абшарніка, часам культурнага, — на некалькі дзесяткоў новых, можа й горшых паразытаў“... „Бо-ж гэтая „рэформа“ дае зямлю ў першую чаргу—не малазямельнаму ды беззямельнаму мясцоваму сялянству; якое адсуваецца Законам ад зямлі, але — панскім лякаём („афіцыялістам“), жаўнерам, аграномам і т. п.“ (з соймавай прамовы пасла Мятлы 6 ліпня 1925 г.).

Ня менш выразна азначыў сутнасьць Закону — ў сваей дэклярацыі ад імя трох Клюбаў „Сялянска-Работніцка Блёку“—пасол Тарашкевіч. „Прыняты Соймам Закон — казаў ён—зьяўляецца замахам аб'яднанае буржуазіі і абшарніцтва на жыцьцёвыя інтарэсы працуючага люду ў Польшчы“. — „Мэта Закону — гэта захаваньне касты абшарнікаў шляхам стварэньня побач з ёй новай арміі кулакоў, здабыцьцё для буржуазіі і абшарніцтва новых саюзьнікаў дзеля барацьбы з вызвольным народным рухам“. „Мэтай Закону зьяўляецца—пазбаўленьне зямлі адзіных яе праўных уласьнікаў — мільёнаў беззямельных і малазямельных сялян, — выкіданьне з бацькаўскай маемасьці беларускіх ды ўкраінскіх сялян і адначасна—ашуківаньне і баламучаньне народных масаў крывадушнымі абяцанкамі“... „Палітыка, праявай якой зьяўляецца Закон, мае мэтай — спольшчыць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну“. „Закон, сулячы Польскаму селяніну зямлю, на якую мае ўсе правы і ўскладае свае спадзяваньні адвеку беларускі і ўкраінскі хлебароб, яўнай мае мэтай пасварыць польскае сялянства з няпольскім, выклікаць між імі нацыянальную ненавісьць, дый — у выніку гэтага разьбіць „дзінства руху працоўных у Польшчы, каб тым лягчэй яго зваяваць“.

Трэба ў заключэньне напомніць нашым чытачом, што аканчальнае прыняцьце амаль ня ўсімі польскімі партыямі ў Сойме, не выключаючы вызваленцаў і пэпээсаў, закону, проці якога барэлася ўся радыкальная сялянска-работніцкая апазыцыя, выклікала нячуваныя здарэньні ў Польскім Сойме... Вычарпаўшы ўсе рэчавыя і ідэйныя доказы, апазыцыя пачала рабіць абструкцыю, якая закончылася пабіцьцём паслоў Сялянска-Работніцкага Блёку.

Тэорыя і практыка.

Абаронцы гэтага Закону даводзілі і ў Сойме і ў прэсе, што ён ўсё-ж такі дае беззямельным ды малазямельным сялянам, а перадусім—батракам з парцэляваных маёнткаў — магчымасьць набываць зямлю з крэдытнай дапамогай ураду ці Зямельнага Банку. Дапамога гэтая прадбачана ў Законе значная: для малазямельнікаў—да 90% вартасьці купленай зямлі, а для беззямельнікаў ды батракоў—аж да 95%. Гэта значыць, што, напрыклад, парабак з парцэляванага маёнту, маючы толькі 50 злотых гатоўкі, мог-бы купіць зямлі—на 1000 злотых, бо рэшту яму мае пазычыць Зямельны Банк... Есьць у законе і яшчэ саладзейшыя рэчы: аб крэдытах на завядзеньне гаспадаркі і шмат іншых...— Дык, здавалася-б—толькі жыві, хлебаробе, ды купляй зямлю ў Польшчы.

Нажаль, дзеля ўсяго гэтага патрэбна— драбніца: грошы ў касе дзяржаўнага скарбу, ды яшчэ другая драбніца: жаданьне польскага ўраду—даць грошы на гэтую дапамогу, ды даваць „польскую зямлю“—беларусу. Трэба было, каб была з'арганізавана ў шырокім маштабе гэтая крэдытная дапамога збоку дзяржавы, дый—каб урад і Зямельны Банк запраўды хацелі крэдытаваць беларускага хлебароба ў яго набыўчай акцыі. Але... дагэтуль ані першага, ані другога неяк ня было! Коратка кажучы: фінансавалася ў нас за гэты час толькі адна акцыя — асадніцтва. Рэшта зямельнага абароту была пакінута ўладай свайму „жыцьцёваму шляху“...

Дзяржаўная ўлада, адмаўляючыся фінансаваць—прадбачаным у законе шляхам— набываньне нашымі малазямельнікамі і беззямельнікамі зямлі з парцэляцыі, адначасна ня выпаўняла і загаданага законам кантролю ды рэгуляваньня парцэляцыйнай акцыі земляўласьнікаў. Гэткім чынам разьвілася

Ляо - Дзе.

Вароны і Каршуны.

(КАЗКА)

Між варонамі падняўся цяпер вялікі шум: старэйшыя былі здаволены, што каршун з нічым мусіў паехаць дамоў, а маладыя, паміж якімі было ўжо шмат зладзеек, хмурыліся.

— „Трэба было з ім дагаварыцца... Ен разумна гаварыў“:—каркалі яны.

— „Дурні вы“, ён хоча нас толькі ашукаць“...—грагалі старэйшыя. „З куніцай мы самі справімся, хай толькі ён нам не перашкаджае“.

— „Справімся, справімся!“,—дражніліся зладзейкі:—Ці ня думаеце можа, што і мы вам будзем проці куніцы памагаць“?

І запраўды, як толькі дзела дайшло да вайны з куніцаю, маладыя вароны сабраліся раптам у кучу і ісьці ў паход адказаліся. Самы горшы бунтаўнік была ў іх невялічкага росту варона, найбольшая гультайка і зладзейка. Няраз яна навет у сваіх варон крала то косьці, то кускі мяса. Пробавалі вароны яе біць і выганяць навет з табарышча, але нічога не памагала: зладзейка прыпільнуе, як вароны займуцца зьбіраньнем ежы ці пагоняцца за куніцай, і зноў у табарышча забярэцца. Дзіўная была гэта варона, яна навет крычала ня так, як усе — гра-гра-гра, а яг-яг-яг. Так яе і назвалі Яг. — І вось гэты Яг, назьбіраўшы сабе кумпанію з розных гультаёў, на вайну з куніцай ісьці адмовіліся.

— „Ня добра Ягу і яго кумпанію пакідаць у табарышчы адных“,—сказала вялікая варона.

— „Але-ж і куніцу далей цярпець нельга“,—адказалі ёй іншыя вароны. Яг то нічога: ён навет гнязда сабе яшчэ сталага ня зьвіў“.

Парадзіліся вароны, парадзіліся, ды рашылі, што трэба з куніцай справу скончыць, не азіраючыся і не чакаючы на Яга і яго кумпанію. Вось і паляцелі на вайну.

А Яг з сваей кумпаніяй гэтага толькі і чакаў. Не пасьпелі вароны адляцець і паўвярсты ад табарышча, а ён ужо са сваімі сябрамі ў самых лепшых гнёздах і засеў.

— „Хай“—кажа—дурні ваююць з куніцай, а нам і так добра“.

— „Трэба было ім з каршуном дагаварыцца, тады б усё добра было, а так нічога яны куне ня зробяць!“ — гавора якаясь падліза Ягу.

— „Праўда“,—думае сабе Яг,—„з куніцай то яны нічога можа ня зробяць, але як вернуцца назад, то нас з гнёздаў павыкідаюць“.

І прышло яму раптам у галаву, што ня блага б было з каршуном дагаварыцца, тады б іх ня толькі з гатовых гнёздаў вароны ня выкідалі-б, а наадварот: мусілі-б яго ў-ва ўсім слухацца. Толькі ён гэта падумаў, як глянь: у тое гняздо, дзе ён сядзеў, каршунёнак ляціць! Задрыжэў ад страху Яг і думае: „Ну прышла мая апошняя хвіліна“! ды ад страху сам ня ведае, што рабіць, — навет і крыкнуць не патрапіў.

Засьмяяўся радасна з падцішка каршунёнак: рад што яго баяцца! Ды й кажа:

— „Пахвалёны будзь, пане Яг. Нябожчык мой пан тата Каршун нізка кланяецца вашмосьці. Паміраючы, ён казаў, што пан дужа разумная варона, а мы, каршуняты, дужа рады, што пан з гэнымі дурнямі на куніцу не пайшоў“.

— „Дзякую вам каршунам за памяць аба мне“,—адказаў Яг і запнуўся, ня ведаючы, што яму больш сказаць каршунёнку.

— „Удзячныя за панаву і панскіх слуг спагаднасьць да нас каршуноў у нашым цяжкім змаганьні з куніцай і помнячы, што куніца варонам шкоды робіць больш, чым каршунам,—прапануе наш каршуні збор пану Ягу сваю помач у вайне з куніцай і з панскімі непрыяцелямі варонамі, а пан мусіце нам абяцаць памагаць таксама.

— „Разумна ён кажа“—шапнула на вуха Яга якаясь зладзейка варона, усьцешыўшыся, што і яна трохі ў гэтай вадзіцы мутнай наловіць рыбкі.

— „А дзеля таго, што, пасьля сьмерці нашага пана таты Каршуна, мы каршуняты не абабралі сабе яшчэ нікога за старшага, прапануе наш каршуні збор пану Ягу ажаніцца з нашай каршунішкай, прыгожанькай сіротцы па пану тату, ды разам з ёю надзець карону нашага нябожчыка пана таты Каршуна“...

— „Ды я-ж жанаты“!—адказаў з жахам Яг.

— „Гэта вы пан па вароньняму закону жанаты, але па нашаму закону, каршуньняму, не жанаты, спакойна і можаце жаніцца яшчэ раз з каршунішкай па закону нашаму“.

— „Але ж я вамі каршунамі загадаваць не патраплю“!—маліўся перапужаны Яг. „Мяне навет вароны ўсе слухаць ня хочуць, а зараз могуць і з гнязда выкінуць“.

— „І гэта ўсё не бяда. Ажаніся толькі пан з каршунішкай,—усё будзе добра! Правіць і загадываць варонамі і слабейшымі каршунамі будзе ад панавага імя збор нашых найлепшых і найспрытнейшых каршуноў“.

— „А я-ж што буду рабіць“?—пытаецца Яг.

— „Нічога. Дадзём пану прыгожае каршуньняе гняздо, будзем пана Яга і яго жонку каршунішку добра карміць і пільнаваць, каб яго ніхто прыпадкам не патурбаваў, а пан Яг пазволіце нам за гэта сяліцца ў гэтым весь гушчары“.

Падумаў з хвіліну Яг ды і кажа.

— „Добра, я згаджаюся“.

Як пачулі гэта рэшта варон зладзеек, так і задрыжэлі ад злосьці.

— „А то ты гэткі, то ты гаворыш толькі аб сабе, а аб нас не!.. Пачакай-жа“!.. закрычэлі яны на ўсе галасы і ўжо махнулі крыльлямі, каб ляцець да рэшты варон.

Каршунёнак аднак і тут знайшоў лек.

— „Пачакайце,—кажа ён да іх. — „Мы аб вас не забыліся, але ня можна ж гаварыць аб усіх разам. Наш каршуні збор падумаў і аб вас. Вы будзеце памагаць нам правіць і загадаваць рэшткай варон, а за гэта пан Яг дасьць вам ня толькі самыя лепшыя дрэвы на гнёзды, але і дасьць вам іх многа на запас — дзеля будучых вашых дзяцей, унукаў і праўнукаў. Далей, наш каршуні збор, калі вы будзеце добра для нас старацца, пазволе вам насіць наш каршуні тытул і пазволе вам жаніцца з каршунішкамі. А што найважнейшае, то гэта тое, што мы, каршуны, паможам вам прымусіць рэшту варон зьбіраць вам на яду смачных чарвякоў і жукоў“.

— „Ен добра кажа“ — грагнула адна варона.

— „Чаго-ж яшчэ табе лепшага трэба“?— дадала другая.

І вось, калі вароны, ня могучы ніяк выгнаць куніцу з яе дупля, вярнуліся к сабе ў табарышча, там ужо шнырaлі каршуняты, а зладзейкі вароны, услужліва кланяючыся, наказывалі ім яшчэ не занятыя пад гнёзды дрэвы і тыя гнёзды, якія належылі варонам-ворагам каршуноў.

— „А гэта ж што значыць? пытаецца варона-начальнік зьдзіўлена.

— „А гэта, бачыце“,—адказывае ёй варона падліза—„мы дагаварыліся з каршуня-

ў Крае—асабліва за апошні год—страшэнная парцэляцыйная анархія, проці якой у першую чаргу і быў скіраваны Закон... — Абшарнікі прадавалі зямлю, каму хацелі—ведама-ж, выбіраючы тых, хто меў грошы і даваў вялікшую цану.—Спэкуляцыя зямлёй нячувана падняла цэны на зямлю ў Краі.

Прызнаньні абаронцаў „рэформы“.

Вынікі „дзікай“ парцэляцыі зямлі абшарнікамі аказаліся настолькі забойчымі для сялянскае беднаты ня толькі на беларускіх абшарах, але і на чыста польскіх, што аб гэтым не маглі маўчаць навет „згодніцкія“ газэты, якія ў свой час так горача баранілі „закон аб парцэляцыі і асадніцтве“. Навет пэпээсаўскі „Роботнік“, орган партыі, якая пробуе жыраваць сярод сялянства, бо работнікі яе ўсе больш пакідаюць,—навет і гэты лейб-орган абаронцаў „сацыяльнае раўнавагі“ быў прымушаны зьвярнуць увагу „свайго“ ураду на тое, што творыцца на груньце „зямельнае рэформы“...

У радзе цікаўных артыкулаў у „Роботніку“ п. Мар. Навіцкі дае яркі абраз тэй страшэннай „парцэляцыйнай ахархіі, якая, як сказана, асабліва расшалелася ў Польшчы—якраз пасьля „ухваленьня“ Зямельнага Закону... „Зямельныя Управы, — пісаў ён,—давалі абшарнікам налева і направа дазволы на парцэляцыю—без усялякіх засьцярогаў. Дзеля таго ізноў набыўцамі зямлі аказываюцца выключна багатыя сяляне, якія плацяць за зямлю ўдвая больш, чым дазваляе Закон“.

„Можна сабе прадставіць,—сумна кажа гэны пэпээсавац,— з якой радасьцю вясковае насяленьне вітала маёвы пераварот, спадзяючыся на тое, што ўрад, створаны рэвалюцыяй (?), пачне безадкладна выконываць Закон аб Зямельнай Рэформе (?)“. „Нажаль,— дадае ён,—з запраўдным сумам павінны мы тутака сцьвярдзіць, што ад часу пераварота—нічога ў тым парадку не зьмянілася“... Навет, як відаць з яго артыкулаў, яшчэ значна—пагоршылася.

„Зямельныя Управы,—піша ён, — у гэтым годзе выдалі агромную масу дазволаў на прыватную парцэляцыю (ведама-ж — без усялякіх варункаў!); лічба парцэляваных гэктараў—у некалькі разоў перавысіла прадбачаную Законам штогодную колькасьць зямлі“.

Хто-ж купляе гэтую зямлю, парцэляваную з вольнай рукі ды бескантрольна абшарнікамі? Ясна, што толькі той, хто можа плаціць абшарніку падвойную цану за зямлю,—ці з сваіх грошаў, ці—з пазычаных у Зямельным Банку.

Ясна і тое, што сярод гэтых шчасьліўцаў слабасільнага беларускага хлебароба — батрака ды малазямельніка няма.

Польскія „людовыя“ газэты, ды навет той-жа „Роботнік“—напоўнены абураючымі фактамі, ілюструючымі гэтую „дзікую парцэляцыю“,—як прыватнай так сама і ўрадавай ды банкаўскай зямлі. — Усе, хто толькі хоча: афіцэры, гандляры, вясковыя кулакі, арганісты, сэкрэтары біскупаў (!), урадоўцы, — адстаўныя і на службе, ды розныя спэкулянты—ўсе, толькі вось—не працоўныя хлебаробы, атрымліваюць з гэтай „дзікай парцэляцыі“ зямлю... — Газэты сцьвярджаюць, што якраз усей гэтай, ня маючай ніякай сувязі з зямлёй, ды нікому непатрэбнай арміі зямельных паразітаў ці спэкулянтаў урад найахвотней дае крэдытную дапамогу... А зямля з парцэляванага ўрадавага ды абшарніцкага зямельнага фонду Краю ўсё больш уцякае, разыходзіцца, і ўсё —міма рук тых, каму адвечнае, бясспрэчнае „Права на зямлю“ сцьвярдзілі ўрачыстыя дэклярацыі ды Закон першых гадоў паўстаўшай да новага жыцьця польскай рэспублікі.

Дык выходзе, што і тое, што мог-бы даць нашаму селяніну „закон аб парцэляцыі і асадніцтве“, асталося адно толькі на паперы. Што ж суляць выданыя толькі што ўрадам п. Пілсудскага „прэпісы выканаўчэ“ (інструкцыя) да „зямельнае рэформы“?

Адказ на гэтай пытаньне пастараемся даць у чародным нумары нашае газэты.

Сельраб..

(Канец будзе).

„Роботнік“ сцьвярджае, што ўрад ня толькі не ацаніў ахвярнасьці пэпээсаў, але папросту—не зварачае ўжо ніякай увагі на гэтую „камісію тав. Земенцкага“, ды зрабіў з яе для сабе—„параванік без значэньня“.

„Самаўрадавая Рада“.

Нарадзілася яшчэ адна „Рада“, якая мае заступіць парлямант у Польшчы: „Самаўрадавая“. Міністэрства Унутр. Спраў, пры баку якога будзе „даваць апінію“ гэтая Рада ў справах жыцьця самаўрадаў, ужо падало праект яе ў Раду Міністраў.

Урадавая „Рада“ дык ужо нарадзілася, але вось закону аб самаўрадах дагэтуль няма!

Ад 1923 году яшчэ ня можа вылезьці з камісіі „кернікаўскі“ праект закону!

Заграніцай.

Новыя арышты камуністаў у Літве.

У Літве „выкрыта“ новая арганізацыя камуністаў у Вількаміры, дзе арыштаваны 30 асоб.

Паразуменьне ў справе нямецкіх крэпасьцяў на Усходзе.

„ПАТ“ паведаміў, што між Радай Паслоў і нямецкім урадам, як мы і прадбачылі, дайшло у апошні мамэнт да паразуменьня— у справе нямецкіх крэпасьцяў на ўсходняй нямецкай граніцы. Точных інфармацыяў яшчэ няма, але—быццам немцы згадзіліся на зьлiквідаваньне поўнай часткі гэтых укрепленьняў.

Ад 1 лютага аднача́сна ліквідуецца Міжсаюзная ваенна - кантрольная Камісія, якая, седзючы ў Бэрліне, вымагала вялікіх выдаткаў ад нямецкага скарбу ды наагул абурала нямецкую амбіцыю, як знак паняволеньня пераможцамі. Нямецкая прэса, выражаючы радасьць з прычыны гэтага, піша, што цяпер усе высілкі трэба зьвярнуць на— скасаваньне акупацыі нямецкай зямлі ўздоўж Рэйну, а пасьля—дабіцца перагляду ўсходніх граніцаў...

Новы ўрад у Югаславіі.

У Югаславіі скончыўся ўрадавы крызіс—стварэньнем габінэту Узуновіча (радыкала). Гэта ўжо шосты раз Узуновіч творыць урад. Склад ураду азначае паразуменьне між сэрбамі, харватамі і славенцамі.

Усюды паразуменьне, а ў нас — „завагненьне“...

Мак-Дональд аб англійскай палітыцы ў Кітаі.

Павадыр англійскіх сацыялістаў Мак-Дональд сказаў вялікую прамову аб кітайска-англійскім канфлікце, у якой заявіў, што для Англіі значна карысьней было-б „прызнаць поўную незалежнасьць Кітаю і раўнапраўнасьць яго. Тады торговыя зносіны Англіі з Кітаем разьвіваліся б без усялякіх канфліктаў.

Як пабілі ды пагражаюць зусім выгнаць з краю, дык тады—„прызналі, што выгадней“—ня быць жываедамі.

Разрыў перагавораў між кантонскім урадам і Англіяй.

У Лёндане атрымана вестка аб сарваньні перагавораў між англійскім паўнамоцнікам у Хаькоў і кантонскім урадам.

На рад прапазіцыяў англійскага ўраду— з рознымі „ўступкамі“, кітайскі ўрад адказаў каротка. але ясна: сьпярша далоў усе войскі ды караблі з кітайскай зямлі і з кітайскіх водаў, а пасьля—перагаворы.

Цікаўная таблічка.

Адзін з паслоў падаў у сваей прамове ў Сойме цікаўнае параўнаньне заробкаў работніка ў Польшчы і ў іншых краёх Эўропы.

Калі прыняць за 100 (злотых ці іншых манэтных адзінак) найменшыя выдаткі, якія бязумоўна неабходны для падтрыманьня жыцьця работніка ў Польшчы (—паводле аблічэньня Галоўнай Статыстычнай Управы ў Варшаве), — дый пагледзець, што фактычна атрымлівае польскі работнік, за сваю працу, дык пабачым, што: спэцыяліст мэталіст мае ў Польшчы толькі — 59 адзінак, вугляков у Дамброўскім раёне—77, ткач у Лодзі—80.

Калі прымем за 100 адзінак даваенныя заробкі, дык будзем мець у сучаснай Польшчы заработную плату: польскага вуглякопа — 68 адзінак, нямецкага — 91, англійскага — 90. Польскага мэталісты — 72, нямецкага — 87, англійскага—95, аўстрыяцкага — 106. Польскага ткача — 70, нямецкага — 88, англійскага — 120, аўстрыяцкага — 126.

Калі прыняць за 100 адзінак плату варшаўскага работніка ў 1914 г., дык цяпер атрымліваюць: варшаўскі работнік сярэдня — 70 адзінак, бэрлінскі — 182, парыжскі — 117, венскі — 149, лёнданскі — 287.

Ці ж можа польскі работнік у гэткіх варунках купляць усё патрэбнае яму для падтрыманьня свайго жыцьця?... Ці ня будзе змушвны ён распачаць барацьбу за паляпшэньне свайго быту?!

Да падпішчыкаў.

Просім усіх тых паважаных падпішчыкаў, каторыя маюць які-колечы інтарэс у адміністрацыі нашае газэты, прытрымлівацца гэтых правілаў.

1) Падпісную плату перасылаць беспасрэдна ў адміністрацыю з паказаньнем падробнага адрасу падпішчыка, а калі разам прысылаецца ад некальніх падпішчыкаў, дык адрас кожнага падпішчыка і колькі ад кaго грошы.

2) Пры ўсялякай перапісцы падаваць свой дакладны адрэс, абавязкова з паказаньнем тае пошты, з каторае атрымліваеце газэту.

3) Пры перамене адрасу падаваць дакладна абодва адрасы — стары і новы, або: каму спыняецца і хто будзе атрымліваць надалей.

ХРОНІКА.

Да справы заарыштаваных паслоў. Усе заарыштаваныя паслы-грамадаўцы, як ведама, знаходзяцца ў Лукішскім вастрозе ў Вільні, куды жонкі і сваякі прыносяць ім ежу. Паслом дазваляюць пісаць пісьмы да сваіх і атрымліваюць ад іх пісьмы і газэты (апошнія — толькі польскія!).

Бачыцца з сваімі не даюць. Дагэтуль толькі аднаму паслу Мятле дазволілі пабачыцца з сваім братам.

Там-жа, на Лукішках, трымаюць і заарыштаваных культурных дзеячоў: старшыню Т-ва Беларускае Школы (ён-жа дырэктар Віл. Белар. Гімназіі) Астроўскага, сэкрэтара гэнага-ж Т-ва Шнаркевіча, дырэктара Белар. Каап. Банку сьвяшч. Каўша. На Лукішках сідзяць і грамадаўцы: галоўны сэкрэтар Грамады Бурсэвіч, юрысконсульт Акінчыц, працаўнік Цэнтр. Сэкрэтарыяту Назарук і інш.

Беларускі Каапэр. Банк. Ня гледзячы на зробленыя Беларускаму Каапэратыўнаму Банку ўдары (арышт сяброў дырэкцыі, кніг банковых і дакумэнтаў),—праца яго йдзе нармальна. Часова выбрана новая дырэкцыя ў складзе сяброў: Ігната Біндзюка, Івана Савіцкага і Міхала Заморына. Выдача ўкладаў ня спынялася ні на

У Польшчы.

Новы „бацька нацыянальных меншасьцяў“.

„Роботнік“, падаючы вестку аб кандыдатуры палкоўн. Вал. Славэка на становішча „віцэ-міністра для спраў нацыянальных меншасьцяў“, інфармуе аб тым, што гэты кандыдат быў у часе вайны з бальшавікамі шэфам II аддзелу (дэфэнзывы) штабу генарала Шэптыцкага. У канцы газэта дадае, што—„з зьдзіўленьнем даведалася аб тым, быццам палк. Славэк — знаўца меншасьцёвых спраў, дый што спэцыяльна цікавіцца гэтым пытаньнем“. Як ведама, пакуль што палк. Славэк уваходзіць у склад „габінэту віцэ-прэм'ера Бартля“, як яго „ўрадовец дзеля асаблівых даручэньняў“. Можна сказаць, што справа меншасьцяў цяпер наагул „у добрых руках“.

Зьмены ў „палітычнай адміністрацыі“.

Як пішуць газэты, начальнікам „Аддзелу Бясьпечнасьці“ (дэпартаманту паліцыі ў Міністр. Унутр. Спраў) мае быць назначаны былы шэф віленскай палітычнай паліцыі п. Кавэцкі, які апошні час быў толькі заступнікам начальніка гэтага аддзелу.

Вільня наагул мае добрую меру цяпер у Варшаве.

Выключэньне пасла Галкі з „Вызваленьня“.

Слаўнае „Вызваленьне“ страціла яшчэ аднаго пасла ў Сойме. Пасол Галка выключаны з партыі—за нейкія махінацыі пры публічных работах, у якіх ён прымаў учасьце, як прадпрыемца. Партыя запыталася ў пасла Галкі, ці праўда ўсё тое, аб чым яна даведалася. Той адказаў... маўчаньнем! Тады і выключылі.

Гэткім чынам—ад вялікага клюбу з 70 з лішкам сяброў асталося толькі ўсяго—23.

„Спаведны акульнік“ мін. Бартля.

Пакідаючы становішча міністра рэлігіяў і публічнай асьветы, п. Бартэль выдаў да школьных уладаў „акульнік“ (цыркуляр) такога клерыкальнага зьместу, якіх не выдавалі найслаўнейшыя міністры „народнаго просвѣщенія“ за часоў царызму. Цыркуляр аддае рэлігійнае сумленьне, якое паводле Канстытуцыі лічыцца „вольным“, ня толькі вучняў, але пасрэдна і іх бацькоў—пад „нагляд“ ксяндзоў ці іншых „духоўных айцоў“. Цікаўна, паміж іншым, што ўсе вучні абязываюцца хадзіць на споведзь да ксяндзоў— тры раза ў год. Навет за царызмам вымагалася—толькі раз, дый каталіцкая царква вымагае ня больш!

Пэпээсы абураны!...

„Роботнік“ абураецца на ўрад. — Урад стварыў пры Гаспадарчым Камітэце Рады Міністраў рад „дарадчых камісіяў“, паміж іншымі—і „дарадчую камісію Працы“, у якую П. П. С. дала сваіх „найлепшых знаўцаў“, у тым ліку і старшыню тав. Земенцкага. Гэткім чынам П. П. С. ахвяравала ўраду сваё фактычнае супрацоўніцтва, хаця ўдае, быццам стаіць у апазыцыі да ўраду. Але вось

тамі ня тольк' жыць у згодзе і дружбе, але жыць у адным месцы“.

— „Вось яно што?!. Дык чаму-ж вы не ляцелі к ім у табарышча, а пусьцілі іх ў наша?

— „К каршунам у табарышча адлятае Яг. Ен жэніцца з каршунішкай і будзе там жыць“—адказывае ім падліза.

— „А вы гэтаму і рады?! Дурні-ж вы!.. Ці вы ня бачыце, што яны забіраюць ад нас Ягу аднаго сабе за служку, а нам паслалі ўжо паноў паглядзеце колькі“!—і варона начальнік пачала лічыць: „Адзін, два, тры... сто... дзьвесьце... Э, ды, як відаць, іх і ня зьлічыш“...

— „Гэта што тут за зборышча“?.. — крыкнуў раптам грозна падляцеўшы каршун. „Імем яго міласьці караля каршуноў і вялікага князя варон, найясьнейшага пана Яга, ўсякія парады аб гэтым забараняюцца. Той-жа, хто гэтага загаду не паслухае, караны будзе сьмерцю, мяса яго аддадзена каршунам на яду, пер'е — воронам падлізам на гнёзды, а гнёзды непакор будуць аддадзены каршунятам“.

Пазелянена ў вачах варон ад гэтых слоў, думкі паблуталіся ў галаве, і самі ня ведаюць, што ім рабіць? — Справа ясна: ваяваць трэба з каршунятамі і з падлізамі, што аграбілі іх такім зладзейскім спосабам, а яны памарыліся ўжо і так, ваюючы з куніцай.

— „Дык вы паслухаеце загаду яго міласьці караля і вялікага князя Яга, ці не“? пытаецца ізноў грозна каршун.

Агляну́ліся вароны, аж паміж імі і каля іх ужо каршунят і варон-падлізаў паўнюсенька! Вочы іх гараць якімсьці дзікім агнём, капцюры канвульсіўна сьціскаюцца — толькі і чакаюць, здаецца, каб учапіцца ў чыёсь пер'е. Бачаць вароны, што кепская справа: ня справіцца ім цяпер з аб'яднанымі сіламі сваіх здраднікаў і каршуноў; заплакалі ціха і пачалі разьлятацца па сваіх гнёздах. Глядзяць: аж у самых найлепшых гнёздах сядзяць ужо то жонкі варон-здраднікаў, то каршуноў.

— „Чаму гнёзды нашы пазаймалі“? — пытаюцца яны.

— „Вашы гнёзды?.. ха-ха-ха... вось дык запраўды дурныя вароны! Вашы гнёзды вераб'і параскідалі, а гэтыя нам даў кароль Яг.

— „Але-ж якое ён меў права ?!.. Гэтаж гнёзды не яго, а нашы“...

— „Нічога мы ня ведаем аб вашых гнёздах, а вы тут нам галоў ня дурыце ды разьлятайцеся.—Чорт вас ня возьме, і новыя паробіце сабе гнёзды, а хто ня будзе слухацца, з тым паступім па загаду...

Бачаць вароны, што нічога ня зробіш: гнёздаў сілай не адбярэш пакуль-што. А вясна ўжо даўно на двары; цёплае сонца радасна глядзіць на зямлю, сьнегу амаль зусім няма. Пара думаць і аб дзецях. Пабедавалі вароны, падумалі, ды і рашылі новыя гнёзды строіць.

Тыц яны ў адно месца к незанятаму дрэву— месца не благое; але толькі сунулася варона з прутком у яго лапкі, як якісьці каршун ужо і крычыць, што гэта дрэва ім занята; кінуліся да другога дрэва—занята, к трэцьцяму—і там занята.

— „Якое занята, калі на гэтых дрэвах ніхто-ж гнёздаў ня рабіў“?

— „Гэта ня важна:—у нас будуць дзеці, пасьля ўнукі, а там праўнукі, — для іх гэтыя дрэвы і пакідаем мы ў запасе“—адказала ім варона-падліза.

— „А нам-жа дзе дзецца“?

— „Можаце па дзесяць гнёздаў на адным дрэве рабіць... Мы-ж у вас ня ўсе гнёзды забралі“...

І прасіліся вароны, і маліліся, што ім недзе гнёздаў рабіць,—нічога не памагае: на пустых дрэвах сяліцца ўжо не пазваляюць!

Хацелі некатарыя вароны кінуць гэтае табарышча і шукаць новага, але тыя, у якіх гнёзды засталіся незачэпленыя, не згадзіліся. Шкада ім кідаць гняздо, ды і месца ўжо старое, знаёмае, жыры вядомыя,—адным словам, родны край, тут і куст маці. А ў другім месцы—хто яго ведае, як будзе, ды і заняты ўжо ўсе лясы іншымі птушкамі.

І вось пачалі вароны віць сабе па два і па тры гнёзды на дрэве. Кепска і нявыгодна жыць гэтак. А тут дзеці з кожным годам прыбываюць і ім трэба месца.

Прыдумала якаясь варона папрасіць месца на дрэве для сваіх дзяцей у якойсь падлізы.

— „Добра“—кажа падліза—„могуць яны зьвіць сабе гняздо на маім дрэве троху ніжэй за маё, але за гэта яны будуць кожны тыдзень тры дні чарвякоў ды жукоў для мяне і маіх дзяцей насіць“.

Абідна стала вароне. Дай, думаю, папрашу дрэва ў каршуна якога. А каршун ёй і кажа:

— „Месца ёсьць, але дарма ня дам; калі на маім дрэве ніжэй за мяне зрабіць гняздо,—то трэба кожны тыдзень мне двух курчатак прынесьці ад гнязда; а калі хочаце, каб цэлае дрэва пустое заняць, — то мусіце мне за яго арэнды шэсьць курчат што-тыдзень прыносіць“.

— „Але ж, паночку, мы курчат красьці ня ўмеем“!—адказаваюць яму вароны.

— „Што за ня ўмеем“?... У няўмекі капцюры не калекі,—скажыце лепш, што вы гультаі“!—прашыпеў каршун.

Заплакалі вароны ад гора і кажуць адна адзэй:

— „Лепш будзем сяліцца ў падліз: усё-ж такі чарвякоў зьбіраць ня тое што красьці“. Але-ж усім не зьмясьціцца на старых дрэвах, прышлося і каршунам пакланіцца.

Блага жылося воронам на дрэвах падліз, ня лепш і на дрэвах каршуноў. Не прынясе хай каторая з іх у назначаны дзень чарвякоў ці курчанё, падліза ці каршун і ўчэпліваецца ей у пер'-е. Папробуе варона бараніцца, гракне злосна падліза і з усіх бакоў каршуны ды падлізы лятуць; учэпяцца яны ў гаротніцу і чуць да сьмерці не заклююць.

— „Няма жыцьця, трэба ўцякаць кудысь“—думаюць сабе маладыя вароны, ды адна па адзэй і давай уцякаць ў шырокі сьвет.

Агледзіліся падлізы і каршуны і гвалт паднялі.

— „Як яны гэта сьмеюць“! — крычаць яны злосна: „А хто ім пазволіў табарышча кідаць? А чарвякоў ды курчат хто нам знасіць будзе“?

Паставілі каршуны і падлізы кругом табарышча і палёў для жыру варту—пільнаваць, каб ніводная варона без дазволу не ўцякла нікуды. Пасьмее толькі якая варона ўцякаць, — зловяць вартаўнікі на граніцы і да сьмерці заклююць.

І рашылі каршуны і падлізы, што знасіць курчат і чарвякоў мусяць усе чыста вароны—навет і тыя, што зьбіўшы ў кучу па гнёздаў дзесяць дванцаць на адным дрэве, жылі яшчэ свабодна. Такіх незахопленых дармаедамі дрэў было ня шмат, але і іх пасьля гэтага падзялілі мі-ж сабою каршуны ды падлізы. Цяпер для варон пачалося сапраўднае пекла. Іх пачалі прадаваць, мяняць, дзяліць, пераваджіць з вароньняга табарышча ў каршуньняе і наадварот, а за кожнае непаслухмянства білі да паўсьмерці. У горы вялікім забыліся навет вароны, што іх прэдкі калісь вольныя былі і ня служылі прыгону ні каршунам ні варонам.

— „Так блага, відаць, і ў пекле ня будзе“—думаюць сабе бедныя вароны.

(Канец будзе).

адзін дзень, ды паступілі трэбаваньні выдачы паложаных грошы толькі ад некалькіх асоб.

Вялікую шкоду Глыбоцкаму аддзелу зрабіла ўлада, забраўшы беспадстаўна вэксалі. 23 з іх з гэтае прычыны не маглі быць ані аплочаны своечасна, ані апратэставаны. Замест заарыштаванага грам. Сакалоўскага кіруе аддзелам грам. Скурка.

Сёлетнія культурныя юбілеі. Сёлета прыпадаюць тры літэратурныя юбілеі. Мінае 40 гадоў ад ураджэньня Цішкі Гартнага, які жыве і творыць у Радавай Беларусі (прадстаўнік пралетарскага кірунку), Алеся Гаруна, памершага ў 1921 годзе (радзіўся 27-га лютага па ст. ст., ці 12-га марца па нов. ст. 1887 году). Ізноў-жа 25-га траўня (а па старому стылю—12-га траўня) прыпадаюць 10-ыя ўгодкі сьмерці Максіма Багдановіча.

Таварыства Беларускае Школы ўжо падрыхтоўваецца да абходу гэтых юбілеяў, найбліжэйшы з якіх—Алеся Гаруна.

Папулярныя лекцыі. Лекцыя грам. Луцкевіча на тэму „Уступленьне да беларускае літэратуры“, якую ладзіць у гэту суботу ў 7 гадз. вечара Т-ва Беларускае Школы (вул. Сьв.-Ганны 2), распачынае цэлы цыкль публічных лекцыяў, якія маюць на мэце пазнаёміць шырокія колы нашага грамадзянства з беларускай адраджэнскай літэратурай. Чытаць будуць некалькі лектароў.

Безрабоціца ў Вільні. Згодна з тыднёвым рапартам, паданым у міністэрства грамадзкай апекі ў Варшаве, лік безработных за час ад 24 студзеня да 29 студзеня г.г. прадстаўляўся так: Гутнікаў — 21, мэталёўцаў—216, работнікаў будаўляных — 603, іншых кваліфікаваных — 1010, некваліфікаваных — 1408, работнікаў зямляробаў — 273, і інтэлігэнтных працаўнікоў — 1360, што разам выносіць — 5278 на абшары дзейнасьці віленскага П.У.П.П. (Państwowego Urzędu Pośrednictwa Pracy).

З усяго пададзенага ліку безработных, на карыстаньне падмогай маюць права толькі 1665, астальная-ж большасьць безработных застаецца бяз жаднай дапамогі.

У параўнаньні з мінулым тыднем, лік безработных узрос на 43 чалавекі.

Падзяка. 29-га студзеня 1927 г. адбылася вечарына Навасьветскага Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў памешканьні Віленскай Бел. Гімназіі, гдзе было згуляна дзьве камэдыі „Модны шляхцюк“ і „Пасланец“. Збор з вечарыны ў суме 139 зл. 85 гр. пайшоў на культурную мэту.

Праўленьне Навасьветскага Гуртка прыносіць шчырую падзяку тым грамадзянам, якія ўдастоілі сваей прысутнасьцю спэктакль-вечарыну.

Таксама вялікая падзяка артыстам, якія добра ігралі: грам. Анітры, грам. Шыктараву, грам. А. Тарасаву, грам. П. Тарасаву, грам. М. Кляшторны, грам. З. Майсейку і рэжыс. А. Мітрафанаву, і ўсім сябрам Гуртка за чыннае ўчасьце ў вечарыне.

Чэсьць Вам сябры—барацьбіты з цемрай.

Беластоцкія ткачы. Як паведамляе „Роботнік“, беластоцкія ткачы распачалі акцыю за падвышку платы на 40%, пагражаючы — у разе адмовы — забастоўкай. Беластоцкія ткачы зьвярнуліся да прамысловых работнікаў у іншых местах, прапануючы наладзіць супольнае выступленьне.

Афіцыяльны курс грошы на 4-га лютага. Даляр — 8 зл. 95 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

4.II. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,96. Зал. р. 4,70 зл. Чыр. 3 дал. 90 цэн.

З жыцьця Горадні.

× **Папы на ўслугах „мілых“ установаў.** У сувязі з масавымі арыштамі і вобыскамі ў культурных, палітычных і эканамічных дзеячоў на абшары Заходняй Беларусі, ваявода Беластоцкі п. Ромбовскі выдаў супакойваючую адозву да беларускага грамадзянства. Дзеля распаўсюджваньня і расклейкі гэтых адозваў перш-наперш было адведзена „пачэснае“ мейсца — царкве. На дзьвярох было ажно па некалькі штук паналеплена гэтых адозваў, а папы ў гэты дзень з амбоны грамілі Грамаду, арыштаваных паслоў і г. д. Ня ведаю, ці дасталі яны які „okólnik“ (цыркуляр), ці самі сваей ахвотай гэтак стараліся, — але досыць таго, што ў нядзелю 23-га студзеня, калі скончылася служэньне, наш „благороднейшы“ айцец Лечыцкі выйшаў на амбону з адозваю ў руцэ і зачаў яе па сваёму тлумачыць, кажучы, што беларускія паслы—Валошын, Рак-Міхайлоўскі, Тарашкевіч і Мятла — гэта бандыты, і што Грамада—гэта партыя хуліганаў і бандытаў. Маляваў ён у такім духу Сялянска-Работніцкую арганізацыю мінут пятнаццаць. Народ, які слухаў яго, ведаючы, што гэта ёсьць ілжа, зачаў чхаць, кашляць і гудзець. Поп, убачыўшы, што тут можна дайсьці да ліхога канца, не дакончыўшы свае прамовы, пайшоў за аўтар.

Так „айцец духоўны“, ня трэба табе займацца палітыкай! Ведаеш, што цяпер XX век, і народ сам ведаець добра, хто бандыт, хто яго друг, а хто вораг заклятый.

Молат.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Браты! Сяляне і Работнікі места і вёскі!

З цемры бораў-пушчаў і балот Беларусі паўстаюць сьветлыя зоркі культуры—бібліятэчкі, якія ў сучасны момант моцна падтрымліваюць дух адраджэньня беларускіх шэрых масаў. Маладыя бібліятэчкі прыносяць і прынасіцімуць вялізарную карысьць нашым працоўным масам. Ахонаўскі Гурток Т-ва Белар. Школы просіць усіх сьвядомых беларусаў як дзеячоў палітычных, так і культурных ахвяраваць на новаадкрытую бібліятэку ў Ахонаве якія-колечы кнігі, журналы і др. рэчы—згары пасылаем сваё шчырае беларускае „дзякуй“.

Ахвяры просім прысылаць па адрасу: Zdzięcioł poczta, pow. Nowogródzki, wieś Ochonowo, Jan Bośko.

Змаганьне за родную школу.

(Пружанскі пав.).

29-га сьнежня м. г. я, паўнамоцнік жыхароў в. Аранчычы, Ліпоўскае гм., Пружанскага пав., Патапчук Язэп насіў дэклярацыі на родную беларускую школу ў ліку 24 шт. на 34 дзяцей да п. Школьнага Інспэктара ў м. Пружаны. Не заставшы п. Інспэктара дома, я мусіў прастаяць цэлы дзень пад ганкам канцэлярыі п. Інспэктара, а вечарам, не залагодзіўшы справы, змушаны быў ісьці да хаты аж за 12 кілямэтраў. Тое самае было і 30-га сьнежня. 31-га сьнежня, саб раўшы апошнія сілы зноў, я пашоў да п. Інспэктара. Але і ў гэты, апошні дзень складаньня дэклярацыяў на беларускую школу я нічога не дабіўся. Ад 9 гадз. канцэлярыя была зачынена, а на пытаньне мае, гдзе п. Інспэктар—нейкі панок некалькі разоў адказываў мне, што няма яго дома.

І так, нічога не дабіўшыся, я змушаны быў паслаць дэклярацыі ў Варшаву на імя Пасольскага Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.

Пры ўсіх маіх мучэньнях пад ганкам пана Інспэктара былі сьведкамі Сьцяпан Каляда і М. Чэрнякевіч з в. Сухаволя, Шэрашэўскае гм., Пружанскага пав., якія па тэй-жа прычыне здаць сваіх дэклярацыяў не маглі і таксама іх паслалі ў Варшаву.

Бачыце, грамадзяне, як мучаць нас інспэктары, не адчыняючы сваіх канцэлярыяў аж па тры дні, абы толькі ня прыняць дэклярацыяў на беларускую школу! Ходзім мы, ходзім па 12 кілямэтраў і больш, па тры дні стаім пад ганкамі паноў Інспэктароў ад рана да вечара, а беларускае школы як няма так няма.

Паўнамоцнік жыхароў в. Аранчычы, Ліпоўскае гм., Пружанскага пав., Патапчук Язэп.

Вёска ня сьпіць.

(Чамяры, Чамерскай гм., Слонімскага пав.).

Шмат ужо пісалася ў свой час у газэтах аб тым, што беларуская вёска прабуджаецца ад свайго векавога сну і пачынае імкнуцца да культурнай працы.

Дык вось і мы, чамераўцы, хочам напісаць пра тое, як у нас прайшлі каляды і пажадаем усім таго самага.

3/I 1927 г. падалі мы слонімскаму старасьце паведамленьне аб тым, што хочам 8/I 1927 г. на другі дзень праваслаўных каляд зрабіць вечарыну, дзе будуць згуляны наступныя п'есы: „У кавалёвай хаце“, „Модны шляхцюк“ і „Стараста“, пры чым, разам з паведамленьнем паслалі і памянёныя п'ескі.

Стараста абяцаў прыслаць дазвол, або запярэчаньне праз пошту,

Нашы маладыя артысты прыгатавалі п'есы надта добра і, ня гледзячы на тое, што ад старосты не атрымалі ніякага адказу, у назначаны тэрмін збудавалі сцэну ў сялянскай хаце і зрабілі, што трэба было.

Усё прайшло так жыва і весела, што лепей ня трэба.

І малыя і старыя сабраліся ня толькі з Чамяроў, але і з бліжэйшых суседніх вёсак. Бяда толькі тая, што за малое было памешканьне і дзеля гэтага шмат каму прышлося стаяць на панадворку, ня бачучы, што робіцца ў хаце.

Спачатку паставілі: „У кавалёвай хаце“ і хаця нашы маладыя артысты першы раз прыймалі ўдзел у сцэнічных гульнях, аднак жа згуляна было надта добра і народ страшна зацікаўлены быў гэтай п'есай.

Пасьля — „Модны шляхцюк“ таксама прайшоў ня менш цікава, як і „У кавалёвай хаце“.

Апошняй была згуляна „Стараста“, якая дала ўсім столькі сьмеху, што трудна і апісаць.

Адным словам, п'есы былі пастаўлены надта добра.

Калі скончыўся спэктакль, хлапцы і дзяўчаты дэклямавалі вершы, якія ўзбудзілі публіку ад сьмеху да такога бодрага настрою, што пасканчэньні ўсяго з грудзей кожнага вырваліся зыкі беларускай марсэльезы: „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі“. Пасьля запяялі яшчэ некалькі беларускіх песень, сказалі маленькую прамову адносна народнага дому і гэтым усё закончылася.

Каля дзесятай гадзіны ўночы ўсе разышліся дамоў у бодрым і вясёлым настрою і з лепшай надзеяй у будучыну, а моладзь, наняўшы музыканта, зрабіла танцы да гадзіны другой.

Дык вось, як правялі нашы маладыя каляды,—замест таго, каб напіцца гарэлкі і валяцца дзе-небудзь у сьнягу, або гуляць у карты.

Чэсьць і слава вам, чамяроўскія хлапцы і дзяўчаты, барацьбітам з цемнатою; Вы, як маладыя арляняты, на вас уся надзея вашых бацькоў, замучаных панскім бізуном, на вас надзея ўсяго працоўнага люду нашай бацькаўшчыны — Беларусі!

Засявайце навуку ў народзе, не марнуйце дарма часу!

Толькі тады мы зможам збавіцца ад уціску паноў, калі будзем мець сваю культуру!

Давайце прыклады другім вёскам! Няхай жывуць нашы артысты!

Ям.

Нам пішуць з вёскі што:

× Поп Рудніцкае парахвіі, Пружанскага пав., так сквапны на грошы, што адабраў царкоўную зямлю ў сялян, якую яны арэндавалі да гэтага часу і здаў спэкулянту-жыду за 90 даляраў. Скора пасьля гэтага той-жа поп зьвярнуўся да сялян з просьбай паправіць клебанію, на што сяляне адказалі яму, каб зьвярнуўся з гэтай просьбай да таго жыда, якому аддаў зямлю ў арэнду.

Наагул-жа гэты поп дзярэ з сялян, як толькі можа: за шлюб бярэ з бяднейшага—40 зл., а з багацейшага—50 зл., за пахарон — 30 зл., а за хрэсьбіны—6 зл. Вось якога духоўнага бацьку маем.

× Да грамадзяніна вёскі Красьне, Пружанскага пав., Нічыпара Крысталчука прышоў 10 сьнежня м. г. паліцыянт Вялікасельскага пастарунку Курджын і спытаў, ці ёсьць у вёсцы гурткі. Той думаў, думаў, а пасьля й кажа: „Не, паночку, няма ў нас Грудкоўскіх. Во ў Ліхасельцах то ёсьць, а ў нас няма“. З тым і пашоў паліцыянт сабе далей.

× Вучыцелька польскай школы ў в. Нагорных, Баранавіцкага пав., вучыць нашых дзяцей толькі цацкі рабіць: конікі, крэслы і іншыя глупствы, а аб навуцы то няма і паміну. Ды і наагул у школе ніякага парадку няма.

× Слуга абшарніка Трэнбіцкага 28-га сьнежня м. г. забіў з рэвальвэра грам. Пётру Гумэна з в. Ліпова, Ліпоўскае гм., Пружанскага пав., за тое, што Гумэн на полі Трэнбіцкага высек 2 аглоблі. Вось дык шчыры панскі прыслужнік.

× Паўла Лупінка, з Курапаля, Пастаўскае гм., хоць і цёмны, як бутэлька, служыць шпіком і даносіць усялякія брэдні паліцыі, што толькі яму ўздумаецца. Так прынёс ён іржавую вінтоўку адкульсьці і ўторкнуў у страху ў хату грам. А. Хаткевіча, а пасьля паклікаў паліцыянтаў і сказаў ім, што ў грам. Хаткевіча схавана пад страхой вінтоўка. Іншыя грамадзяне відзелі, як Лупінка торкаў пад страху вінтоўку і на судзе сказалі гэта і зацьвердзілі прысягай. Ня гледзячы на гэта, суд усё-ж засудзіў грам. Хаткевіча.

× У в. Паўловічы, Межырэцкае гм., Ваўкавыскага пав., адзін з сялян запрапанаваў солтысу Юльяну Паляшуку выпаўніць дэклярацыю на беларускую школу і пацьвердзіць у войта. Але ўспомнены солтыс адмовіўся ад падачы дэклярацыі на родную беларускую школу, кажучы, што баіцца, каб не разгнявіць гэтым войта і камэнданта паліцыі.

Ганьба табе, пане солтысу. Гэта-ж ты сваей баязьняй хочаш пакінуць дзіця сваё сьляпым!

× Другі селянін тэй-жа вёскі Янка Брыш, баючыся, каб войт не назваў яго бальшавіком не панёс сам у гміну заверыць школьную дэклярацыю. Да другіх-жа сялян казаў так: „Калі будзе ў іншых вёсках беларуская школа—дык і ў нас будзе. А за іншымі справамі дык лезе перш, не баіцца, што войт бальшавіком назаве.

× У польскай школе ў в. Славатычах, Межырэцкае гм., Ваўкавыскага пав., вучыцелька Галена Мардзіжоўна так добра вучыць беларускіх дзетак, што праз тры-чатыры гады навукі яны ведаюць усе літары, ды з горам папалам расьпісываюцца, а лічыць амаль-што зусім ня ўмеюць. За тое часта вучыцелька гэта ладзіць вечарынкі з войтам камэндантамі—ды асаднікамі, пасьля якіх баліць ей галава — дык таму і вучыць ня можа. А як вышла вучыцелька замуж за абшарніка Крагельскага — яшчэ паправілася, пакуль прыедзе, пакуль сагрэецца дык і вучыць няма калі.

× Старшы лясьнік Какошчынскага лясьніцтва не дае жыць сялянам з в. Какошчыцы, пішучы пратаколы на быдла, коні, ня гледзячы, што тыя па лесе і не хадзілі. Так за лета на сялян в. Какошчыцы напісаў пратаколаў на 800 злотых. Летам адбірае ягады, грыбы і б'е жбанкі, а зімой зусім забараняе праз лес хадзіць. Калі спаткае каго ў лесе ўпрэ дубальтоўку ў грудзі і так прымушае варочацца назад.

Да роднай вёскі.

Паслухай, брат із-пад Дубровы
(Магілкі там маіх бацькоў!),—
Паслухай вершык роднай мовы,
Паслухай шчырай праўды слоў!

Уцям, браток, цікуй далёка...
Ці бачыш новую зару,
Як разьляглась, чуць зглядзіць вока,
І ўдоўж над намі і ўгару!?

А ты у сумнай цемры ночы,
Сплючы ў няшчаснай галіце,
Ніяк прадзерць ня можаш вочы,—
І не дабудзішся цябе!..

Ўвесь люд сусьветнае галоты
Закапашыўся вунь—глядзі!
І да супольнае работы
Заве й цябе; хутчэй ідзі!..

Збавіцеля мо' ты чакаеш,
Каб дапамог на ногі ўстаць?
Няўжо-ж, браток, дасюль ня знаеш,
Што нам іх нечага чакаць?!...

Адсюль да самае Жаневы
„Збавіцеляў“ хоць гаці гаць...
Але за нашы жалі, гневы,
Што яны здалелі нам даць?

Або ў той Рызе і Вэрсалі
Цябе там тузалі дарма....
Што твае сьлёзы ім і жалі!
Яны ня скінуць з нас ярма!..

Твае надзеі топчуць марна,
Табе нічога не дадуць
І так у Жаневе, як ў Лёкарна
Бяздольным людам торг вядуць!

Дык вось, братко із-пад Дубровы!
Ў чаканьні лепшага жыцьця
Бяз роднай школы, роднай мовы
Ты чэзьнеш і твае дзіця!...

Да лепшай долі, наш народзе,
Супольным шэрагам ідзі,
Магутнай сілай, ў дружнай згодзе
Будзіся сам, другіх будзі!..

—скі.

Паштовая скрынка.

Беларускаму патрыоту. Карэспандэнцыю Вашу зьмяшчаем скарочанай, дзеля недахвату месца. Перапіс у Вас адбыўся, відаць, неафіцыяльны, якісь прыватны. — **І. Аўхіміву.** Ваша карэспандэнцыя вострая па зьместу, таму непадходзіць. — **С. Шупеньку.** З Вашай карэспандэнцыяй трэба пачакаць. — **М. Марчэні.** Усей Вашай карэспандэнцыі выкарыстаць ня можам. — **Наднёманцу.** Выкарыстоўваем частку Вашай карэспандэнцыі, з астальной трэба пачакаць. — **Рудовічу П.** Вершу Вашага не зьмяшчаем, бо надта востры.—**Нялыганскаму.** Усяго зьмясьціць цяпер ня можна. — **Падпішчыку 5230.** Вашы вершы, як Вы ўгадалі, зьмясьціць ня можам. Але пішыце і апрацоўвайце добра, каб верш быў гладкі. З Вас можа штось выйсьці. — **В. Кульгаўчыку.** Адну карэспандэнцыю зьмяшчаем, другая не на часе.—**Трэнбіцкаму.** Усяго не зьмяшчаем, бо нічога цікавага ў Вашых лістох няма.—**Якубу Місцы.** Карэспандэнцыя Ваша вельмі добра напісана, зьмяшчаем яе цалком. Пішыце больш. Верш хоць і нічога сабе, але не зьмяшчаем, бо баімося, каб не пашкодзіў ён газэце.—**Г. Пятровічу.** Карэспандэнцыі Вашай зьмясьціць ня можам, бо няма месца. У справе кніжак зьвярніцеся да Беларускай Кнігарні (Wilno, Ostrobramska 1). — **Максіму Засіму.** Вершу Вашага зьмясьціць ня можам, па незалежных ад нас прычынах. Наагул-жа пішыце, можа з Вас што і выйдзе.—**Мэханіку.** Вершы за надта вострыя, таму не зьмяшчаем.

Рэдактар-Выдавец: Альберт Эйсак.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.